***У. Ф. Красюк,*** *канд. філасофскіх навук,*
*дац., дац. каф. філасофіі БДУКМ*

# ГЛАБАЛІЗМ МУЛЬТЫКУЛЬТУРАЛІЗМУ І АКСІЯ-АНТАЛАГІЧНАЯ СПАДЧЫНА КУЛЬТУРЫ

Асаблівасцю сучаснага свету з'яўляецца яго няўстойлівасць, супярэчнасць развіцця. Працэсы глабалізацыі накладаюцца на супраціў нацыянальна-дзяржаўных супольнасцей захаваць сваю ідэнтычнасць. Глабалізацыя як шматграннае начынне XXI ст. закранае ўсе сферы планетарнага жыцця; у культуры гэта праяўляецца ў стварэнні новых форм узаемадзеяння традыцый і навыцый. Глабалізацыя надае хаду стандартызацыі, што спрыяе панаванню ўніверсалізму як у матэрыяльных, так і ў духоўных тэхналогіях.

Культуры, якія пад уплывам этнацэнтрызму імкнуцца да самарэалізацыі, сутыкаюцца з наступам тых культур, якія ўжо занялі дамінуючае становішча на ніве сукупнага ўзаемадзеяння. Гэта прыводзіць да канфліктаў, дзе даюць аб сабе ведаць культурныя разлічэнні. Прыкладам цяжкасцей у справе дыялогу культур, якія імкнуцца да інстытуцыяналізацыі, выступае мультыкультуралізм, калі маніфестацыя культурамі, якія прэтэндуюць па пазіцыі лідзіруючых, сваіх канцэптаў натыкоўваецца на аспрэчванне такіх прэтэнзій з боку прадстаўнікоў іншых ментальнасцей. Прыклад развітых краін Заходняй Еўропы, дзе існуюць калоніі імігрантаў, наяўна паказвае глыбіну праблемы.

Грамадства, якое называюць «адкрытым», выступае як праява глабалізацыі. У адкрытым грамадстве крос-культурныя працэсы немінуча праяўляюцца і ў палітычным спектры, які раскрываецца ў каштоўнасцях лібералізму. Гэта значыць, ва ўмовах мультыэтнічных і мультыкультурных супольнасцей палітычнае абаснаванне сукупнага суіснавання розных культур вядзе яшчэ да палітычнага супрацьстаяння паміж імі. Гэта адбываецца таму, што даўленне тытульнай нацыі ва ўсіх сферах сустракае непрыманне гэтага з боку прадстаўнікоў культурнай «перыферыі» соцыуму. Таму, як сведчаць падзеі, мультыкультуралізм не апраўдвае надзей на дасягненне кансенсусу, што і фіксуецца ў адпаведных палітычных колах.

Глабалізм усё больш размывае нацыянальна-дзяржаўныя межы эканамічнымі, палітычнымі, інфармацыйнымі, адука-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнымі і іншымі сувязямі. Таму мультыкультуралізм пашырае свае прэрагатывы, выходзіць за межы асобных краін, фактычна становіцца міждзяржаўнай з’явай. Да прыкладу, ён мае месца не толькі ў асобных краінах Заходняй Еўропы, але і ў межах Еўрапейскага саюзу. Больш таго, можна чакаць яго пашырэння і на іншыя абшары, таму што «крот» глабалізацыі рые спакваля бесперапынна і ва ўсе бакі. Гэта абавязвае, маючы на ўвазе безумоўныя станоўчыя бакі глабалізацыі, звяртаць пільную ўвагу на стан развіцця традыцыйных культур як натуральнай сферы быцця чалавека, з якою ён сябе атаясамлівае. Актуальнасць такой індыкацыі яшчэ і ў тым, што стварэнне сусветнай «сеткі», умацаванне пазіцыі інтэрнэта, пашырэнне праяў віртуальнай рэальнасці размывае напрацаваную стагоддзямі духоўную цэласнасць народа, яго ўнутраную тоеснасць.

У свой час П. Сарокін адзначаў, што культура мінулых стагоддзяў адзначалася несумненнай значнасцю – цэласнасцю, інтэгратыўнасцю, што дазваляла гарманізаваць быццё індывіда і супольнасці. Гэтага не скажам сёння пра сучасную культурную сітуацыю. З аднаго боку, масавая культура задае штамп адносінам людзей да сваіх матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей, а з другой дыферэнцыруе іх успрыманне культурных каштоўнасцей. Ствараюцца ўяўленні аб «высокай» і «нізкай» культурах. Канфрантацыя паміж імі заснавана на «плебейскім пратэсце» супраць высокай культуры, які раскрываецца як у адмаўленні яе каштоўнасцей, так і ў спробе іх знішчэння. Гэта адбываецца таму, што ў прыватным паўсядзённым жыцці людзей, тым больш, што сёння яно шматвектарнае, не знаходзяцца магчымасці для раскрыцця багацця высокай культуры, што стварае ў свядомасці «мас» апазіцыю да іх [1, с. 21].

У гэтым і праяўляецца парадаксальнасць сітуацыі: масавая культура, адштурхоўваючы высокую, не здольна ва ўмовах глабалізацыйных працэсаў аб’яднаць поліфанію розных культур, што існуюць поплеч. Універсалізм не ў стане размыць этнацэнтрычнасць. Універсалізм масавай культуры не мае сілы таму, што яна, на думку мысліцелей Франкфурцкай школы, характарызуецца негатыўнымі атрыбутамі: павярхоўнасцю, аднароднасцю, механічнай узнаўляемасцю, няўстойлівасцю, неарыгінальнасцю. Такая культура не фарміруе душу асобы і народа.

Такім чынам, становіцца відавочным, што глабалізацыя ў першую чаргу спрыяе станаўленню і пашырэнню масавай

культуры, універсалізм якой ва ўмовах масавых камунікацый, дзейнасці СМІ, сацыяльных і інфармацыйна-адукацыйных сувязей з'яўляецца неэфектыўным.

Больш складаным з'яўляецца пытанне пра магчымасці глабалізацыі садзейнічаць развіццю высокай культуры. У ліберальным дэмакратычным грамадстве існуе прынцып стварэння справядлівых умоў, што дазваляюць імкнуцца да роўнасці як сацыяльнага прынцыпу, а не да стварэння самой роўнасці культур. Гэта прыводзіць да таго, што ва ўмовах глабалізацыі наяўна прасочваецца дамінаванне больш буйных і развітых культур, якія навязваюць свае параметры астатнім. Зразумела, этнасы імкнуцца зберагчы свае культурныя багацці і каштоўнасці, таму ўзнікае апазіцыя універсалісцкай эскалацыі. І зноў жа актуалізуецца імкненне да ідэнтыфікацыі свайго сацыяльна-культурнага жыцця ў прадстаўнікоў розных супольнасцей, што існуюць ва ўмовах культурнай дыфузіі, плюралізму культурных парадыгм.

Панегірыкаў глабалізацыі выказана нямала. Таму, каб не паўтарацца, адзначым, што пры ўсіх станоўчых яе праявах адначасова мае месца працэс яе негатыўнага ўздзеяння на нацыянальныя культуры, што вызывае неабходнасць іх ідэнтыфікацыі ў сучасных умовах, захавання і развіцця назапашаных стагоддзямі каштоўнасцей і традыцый.

Мы жывем у глабалізаваным свеце гібрыднасці, зменлівасці і зманлівасці, спрэчнасці і аспрэчвання. Таму натуральным выступае імкненне да ўстойлівасці, вызначэння дакладнасці і адпаведнай надзейнасці. Ва ўлонні культуры гэтаму адпавядаюць тыя базавыя значнасці, што напрацаваны народам за часы яго-нага гістарычнага развіцця, тое, што можна вызначыць словам «традыцыя» (не блытаць з традыцыяналізмам). Менавіта ў ёй захоўваюцца аксіялагічныя сукупнасці культуры, менавіта яна з'яўляецца анталагічнай спадчынай культуры. Разуменне традыцыі – гэта «…ідэалогія захавання чалавечага вымярэння рэальнасці, яе жывога пачатку. Традыцыя становіцца «другой назвай» Быцця, супрацьлегласцю якога можа быць толькі яго страта – Нішто» [2, с. 74]. Сацыяльна-культурная значнасць традыцыі ў тым, што ў час тэхнагеннага развіцця яна не дае разбурацца маралі, адмірацьмастацтву, падаўляць камунікацыі і жывыя стасункі інтэлектаў. У традыцыі захоўваюцца духоўнасць, чалавечнасць. Менавіта ў традыцыі знаходзяцца асновы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сігніфікацыі тых значнасцей і каштоўнасцей, што ствараюць жыццёвы базіс народа. Традыцыя – гэта не толькі застылыя формы, яе можна разглядаць і ў якасці рухавіка, які надае імпульс спалучэннюю чалавека прыроднага і чалавека машыннага. Яе роля ўзрастае таксама ў працэсе трансфармацыі культуры, якая змагаецца за сваю спраўнасць у камп'ютэрна-віртуальным свеце.

Менавіта традыцыя з яе магутным духоўным патэнцыялам вытрымлівае выпрабаванне часам, асноўны змест якога – «…планаванне чыстай, хаця знешне і замаскіраванай і адкрыта не прызнанай тэхнакратыі, перавага самога знешняга боку працэсу цывілізацыі пад усёй сферай культуры ўнутры агульнай формы існавання», што раскрываецца «…у апусташальным удзеянні тэхнічна абумоўленай, пранізваючай і разлагаючай свет дыскрэтнасці ўнутранага існавання» [3, с. 248].

Дзе чэрпаць ідэі і рэсурсы, каб супрацьстаяць націску бездухоўнай лічбова-інфармацыйнай суперіндустрыі, пераўтварэнню культуры ў голую тэхналогію? Сучасны этап постмадэрнісцкай культуры не ў стане стварыць эфектыўнае «супрацьзелле». Жывыя вытокі можа даць толькі хаця і знявечаная урбанізацыяй традыцыйная культура, якая моцная сваёй быційнасцю, чалавечнасцю. Яна можа і павінна арганічна ўпісацца ў інфармацыйнае грамадства, у «інфармацыйную гібрыдызацыю», па словах К. Леві-Строса, гэта значыць у міжкультурны абмен духоўнымі каштоўнасцям.

Аб неабходнасці спалучэння навукова-тэхнічнага развіцця з патрэбамі духоўнага станаўлення чалавецтва, «выпраўлення пагрэшнасцей» у разуменні тэхнаэвалюцыі гавораць прадстаўнікі зусім не рэтраградскай і кансерватыўнай думкі, а тыя дзеячы навукі і культуры, якія ўпэўнены ў перспектыве стварэння інтэграцыі рацыянальнага і духоўнага. Мадэліраванне цывілізацыйных працэсаў, «разважанні, якія кандэнсіруюцца ў першую чаргу вакол тэхналагічных паказчыкаў развіцця…, праяўляюць далёка ідучае супадзенне з гуманістычнай думкай, што імкнецца адшукаць аптымальная ўмовы чалавечага існавання… Пры гэтым шлях, этычна правільны ў чыста гуманістычным разуменні, аказваецца таксама і рацыянальным, бо ён ўзгадняецца з аб'ектыўнымі тэндэнцыямі развіцця» [4, с. 556–557].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спадчына традыцыйнай культуры – не застылая форма, яна тая матрыца, якая надае рух культуратворчасці ў сучасных варунках. Можна пагадзіцца з выказваннем аб тым, што «глабальную цывілізацыю, у якой прымуць удзел грамадзяне свету, патрэбна будзе вырошчваць з мясцовых прывязанасцей, са змястоўных культурных спрэчак; з пераасэнсавання «нашай» ідэнтычнасці; са звычкі да дэмакратычнага эксперыментавання з пабудовай і перабудовай інстытутаў» [5, с. 220]. Традыцыя – гэта зусім не эквівалент традыцыйнай культуры, што адрозніваецца ад тэхнагеннай, гэта надзейны падмурак уваходжання ў цывілізацыю будучага.


1. *Кнабе, Г. С.* Двуединство культуры / Г. С. Кнабе // Материалы к лекциям по общей теории культуры и культуры античного Рима / Г. С. Кнабе. – М., 1993. – С. 25–37.

2. *Кутырев, В. А.* Культура и технология: борьба миров / В. А. Кутырев. – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 239 с.

3. *Вебер, Альфред.* Избранное: Кризис европейской культуры / Альфред Вебер. – СПб. : Университетская книга, 1999. – 565 с.

4. *Лем, Станислав.* Сумма технологии / Станислав Лем. – М. ; СПб. : Terra Fantastika, 2006. – 668 с.

5. *Бенхабиб, Сейла.* Притязания культуры / Сейла Бенхабиб. – М. : – 2005. – 350 с.



***Д. А. Крывашэй,***

*канд. гістарычных навук, дац.,*

*дац. каф. філасофіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі*


# ТРАНСФАРМАЦЫЯ МАДЭЛІ ДЗЯРЖАЎНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў НАВЕЙШЫ ЧАС (1991–2010)

Рэалізацыя культурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь у першай палове 1990-х гг. адбывалася ў складаных сацыяльна-эканамічных умовах. Суворыя ўмовы крызісу, спробы пабудовы рынкавай эканомікі зрабілі папулярнымі ліберальныя ідэі. У сферы культуры гэта знайшло адлюстраванне ў дэкляраванні раўнапраўя і роўнасці ўсіх суб'ектаў культурнай дзейнасці, значным зніжэнні ступені ўдзелу дзяржавы ў рэгуляванні эканамічных працэсаў, адмове ад разнастайнай дзяржаўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ